


**Алег ТРУСАЎ**

# СЯРЭДНЯЯ ЛІТВА



*ТРУСАЎ Алег Анатольевіч — дацэнт кафедры гісторыі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1954 г. у г. Мсціслаў Магілёўскай вобл. Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў 1976 г. Дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з 1990 па 1995 г. З 1999 г. старшыня Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны. Вывучае помнікі манументальнага дойлідства XI—XVIII стст. Аўтар шэрага кніг і артыкулаў па гэтай тэматыцы.*

Пасля распаду буйных імперый на тэрыторыі Еўропы ў XX ст. утварылася шмат як самастойных, так і непрызнаных, часта марыянетачных дзяржаў, якія існавалі нядоўгі час. Але лепей мець марыянетачную дзяржаву, чым быць пад акупацыяй ці ў складзе іншай краіны, нават дэмакратычнай.

Пасля заканчэння першай сусветнай вайны і знікнення Расійскай імперыі ў 1917 г. часовыя дзяржавы ўзнікалі і на тэрыторыі Беларусі. Спробы стварыць такія дзяржаўныя ўтварэнні рабіліся з розным поспехам як бальшавікамі, так і палякамі. Дастаткова прыгадаць Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі (ЛітБел) альбо дзяржаву пад назвай Сярэдняя, альбо Усходняя Літва.

Пасля абвяшчэння БНР і адступлення нямецкіх войскаў бальшавікі 1 студзеня 1919 г. у Смаленску абвясцілі ССРБ у этнаграфічных межах рассялення беларусаў. Аднак ужо 16 студзеня ад яе адлучылі на карысць РСФСР Смаленшчыну, Магілёўшчыну і Віцебшчыну, а 27 лютага стварылі ЛітБел са сталіцай у Вільні. Бальшавікі разглядалі ЛітБел як плацдарм для нападу на Польшчу. У чэрвені 1919 г. у войску ЛітБела было 17 450 чырвонаармейцаў у асноўным з расійскіх губерняў[1].

Польска-савецкая вайна пачалася ў лютым 1919 г. 14 лютага 1919 г. каля Бярозы Картузскай адбылася першая сутычка паміж падраздзяленнямі Чырвонай Арміі і польскімі войскамі. Ужо 19 красавіка палякі захапілі Вільню, а 28 красавіка — Гродна. Урад ЛітБела пераехаў у Менск. 8 жніўня ў Менск увайшлі польскія атрады на чале з генералам Станіславам Шаптыцкім. ЛітБел практычна спыніла сваё існаванне.

У 1918—1919 гг. літоўцы даволі паспяхова будавалі сваю дзяржаву. Спачатку ім актыўна дапамагалі немцы, а потым і краіны Антанты. Галоўным жаданнем літоўцаў было ўключыць у сваю дзяржаву ўсю Віленшчыну разам са старадаўняй сталіцай Вялікага княства Літоўскага. Бальшавікі на гэта глядзелі спачатку адмоўна, але потым, пасля акупацыі палякамі ЛітБела, вельмі станоўча, бо Літва станавілася іх хаўруснікам у змаганні з Польшчай.

11 верасня 1919 г. урад Савецкай Расіі заявіў пра згоду прызнаць Літоўскую дзяржаву і заключыць з ёю мірнае пагадненне. Таму 12 ліпеня 1920 г. У.Ленін прызнае незалежнасць Літвы і перадае ёй захопленыя палякамі Віленскі край разам з Гродна, Шчучынам, Лідай, Ашмянамі, Смаргонню і Браславам. 14 ліпеня Чырвоная Армія займае Вільню, а ў верасні перадае яе літоўцам. 31 ліпеня ў Менску другі раз абвяшчаецца ССРБ, але ў межах толькі былой Мінскай губерні.

У 1919—1920 гг. польскія ўлады не прызнавалі ССРБ і ЛітБел, нягледзячы на заявы ўрада РСФСР аб тым, што тэрытарыяльныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спрэчкі павінны вырашацца паміж Польшчай і ССРБ непасрэдна[2]. Польшча вяла ваенныя дзеянні з Літвой, бо хацела захапіць усю яе тэрыторыю, а не толькі Віленшчыну. Пад ціскам Антанты 7 кастрычніка 1920 г. у Сувалках падпісваецца польска-літоўская дамова, па якой Віленшчына перадавалася Літве.

Адначасова Пілсудскі інспіраваў "бунт" часткі польскага войска на чале з генералам Люцыянам Жалігоўскім супраць гэтай дамовы. Ужо 8 кастрычніка Л.Жалігоўскі захапіў Вільню, абвясціў незалежнасць Віленшчыны і пайшоў на Коўна, авалодаў мястэчкам Кейданы. Толькі ў раёне Шырвінтаса літоўцы здолелі спыніць яго[3].

29 лістапада 1920 г. пад ціскам Лігі Нацый бакі заключылі перамір'е. Стварылася фармальна незалежная дзяржава пад назвай Сярэдняя Літва. Яе кіраўніком стаў генерал Л.Жалігоўскі. Ён нарадзіўся ў Ашмянах у 1865 г. З 1885 г. Люцыян Жалігоўскі кадравы афіцэр рускага войска, удзельнік руска-японскай вайны. Быў камандзірам палка. З ліпеня 1917 г. у складзе польскага корпуса генерала Ю.Доўбар-Мусніцкага ваяваў з бальшавікамі. Потым камандаваў польскай дывізіяй у арміі генерала А.Дзянікіна.

У красавіку 1919 г. яго дывізія далучылася да польскага войска. З верасня 1919 г. Л.Жалігоўскі кіруе войскамі, што наступалі на Менск, камандуе першай літоўска-беларускай дывізіяй, дзе служылі мясцовыя ("краёвыя") палякі. Менавіта гэтая дывізія і "ўзбунтавалася" 8 кастрычніка 1920 г. супраць перадачы Віленшчыны Літве.

12 кастрычніка Л.Жалігоўскі абвясціў незалежнасць Сярэдняй Літвы і фактычна ўзначаліў яе. Пазней ён быў міністрам вайсковых спраў Польшчы, дэпутатам польскага сойма. Потым жыў у эміграцыі, падтрымліваў польскі эмігранцкі ўрад у Лондане. Л.Жалігоўскі памёр у 1947 г.[4]. Дарэчы, у г. Лідзе да 9 студзеня 1940 г. існавала вуліца, названая ў яго гонар. Цяпер гэта вуліца носіць імя Фелікса Дзяржынскага.

Сярэдняя Літва складалася з 10 паветаў. Найбольш буйнымі гарадамі яе былі Вільня, Трокі, Смаргонь і Ашмяны. Гродна і Ліду палякі Л.Жалігоўскаму не аддалі і адразу ўключылі гэтыя гарады ў склад Польшчы. На тэрыторыі Сярэдняй Літвы жылі 530 тысяч чалавек, з іх беларусы складалі 40%[5]. Л.Жалігоўскі прызначыў урад — Часовую кіруючую камісію на чале з Абрамовічам, які быў "краёўцам" і выступаў за федэратыўную дзяржаву накшталт былой Рэчы Паспалітай. Новая дзяржава мела свае грошы (польскія маркі), сімволіку і нават паштовыя маркі.

Першыя паштовыя маркі новай дзяржавы выйшлі 20 кастрычніка 1920 г. і мелі выяву двух гербаў, польскага арла і "Пагоні". На марках 1920—1922 гг. можна ўбачыць выявы помнікаў гісторыі і архітэктуры Вільні (сярод якіх касцёл св. Ганны і Вострая Брама), партрэты каралевы Ядвігі і караля Ягайлы, Тадэвуша Касцюшкі і Адама Міцкевіча. Некалькі разоў выходзілі маркі з партрэтам Л.Жалігоўскага. У лістападзе 1921 г. выйшла марка, прысвечаная ўваходу войска Л.Жалігоўскага ў Вільню 9 кастрычніка 1920 г.[6].

Л.Жалігоўскі, у адрозненне ад іншых дзяржаўных дзеячаў Польшчы, ставіўся да беларускай справы даволі прыхільна. Урад БНР падтрымаў новую ўладу. Ковенскі ўрад на чале з В.Ластоўскім быў супраць яе. Была нават спроба назваць новую краіну Заходняя Беларусь, але гэтая прапанова не знайшла падтрымкі.

Сярод прыхільнікаў Л.Жалігоўскага былі А.Луцкевіч, А.Смоліч, Б.Тарашкевіч, М.Гарэцкі і ксёндз А.Станкевіч[7]. Б.Тарашкевіч займаў пасаду кіраўніка беларускага сектара ў дэпартаменце асветы ўрада Сярэдняй Літвы. У 1921 г. А.Луцкевіч стварыў Беларускі музей імя Івана Луцкевіча, а Б.Тарашкевіч — Таварыства беларускай школы (ТБШ). Былі адкрыты беларуская гімназія ў Вільні і беларуская настаўніцкая гімназія ў Барунах (Ашмяншчына). Вясною 1921 г. на тэрыторыі Сярэдняй Літвы дзейнічалі 186 беларускіх школ.

Пільна сачыў за падзеямі ў Вільні і Янка Купала. У газеце "Звон" у 1919 г. выйшаў яго артыкул "Уваскрашэнне польскага універсітэту ў Вільні", у якім ён назваў Вільню спрэчным горадам, на які заяўляюць свае правы тры дзяржавы — Польшча, Літва і Беларусь[8].

Спрачаючыся ў Лізе Нацый з Літвою за Віленшчыну, Польшча хацела даказаць, што са сваімі нацыянальнымі меншасцямі яна абыходзіцца сумленна. Пасля падпісання Рыжскай мірнай дамовы на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі 400 беларускіх пачатковых школ, 7 поўных школ і тры настаўніцкія семінарыі. Часткова фінансавалася беларуская культурная дзейнасць і нават беларускі нацыянальны друк[9].

У Сярэдняй Літве існавала самастойная судовая сістэма. Краіна, аднак, залежала ад грашовых крэдытаў польскага ўрада, а эканоміка — ад стану гаспадаркі Польшчы і польскай грашовай адзінкі — маркі. У 1921 г. быў распрацаваны праект электрыфікацыі, існавалі 432 прамысловыя і каля 1 370 дробных прадпрыемстваў[10].

Большасць насельніцтва краіны займалася сельскай гаспадаркай. Да 1923 г. на Віленшчыне быў выдзелены 961 зямельны ўчастак для пасялення польскіх каланістаў-асаднікаў. 6 470 гаспадарак, што належалі былым вайскоўцам і дзеячам розных арганізацый, дадаткова атрымалі ў сярэднім па 2,5 га зямлі на кожную гаспадарку[11]. Набываць зямлю маглі толькі тыя сяляне, якія былі палякамі альбо запісваліся імі і належалі да каталіцкай царквы. Некаторыя вёскі рассялялі на хутары.

Пасля захопу Л.Жалігоўскім Віленшчыны Літва разарвала дыпламатычныя адносіны з Польшчай і да верасня 1939 г. знаходзілася з ёю ў стане вайны. Літву падтрымаў ковенскі ўрад БНР на чале з В.Ластоўскім, а таксама Масква. 9 студзеня 1921 г. былі прызначаны выбары ў сойм новай дзяржавы, але супраць выступіла Ліга Нацый, якая прыняла рашэнне правесці тут плебісцыт і хацела ўвесці замежныя войскі.

Аднак гэтае рашэнне аспрэчылі літоўцы і бальшавікі. Адбыліся перамовы ў Бруселі і Жэневе. Міністр замежных спраў Бельгіі Гіманс прапанаваў аддаць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віленшчыну Літве як аўтаномную вобласць і ўключыць Літву ў вайсковы і эканамічны саюз з Польшчай. Але Літва ад такога варыянта адмовілася.

30 лістапада 1921 г. Л.Жалігоўскі перадаў усю ўладу старшыні Часовай кіруючай камісіі і выехаў з Вільні ў Польшчу.

Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні ў канцы 1921 г. адмовіўся ад удзелу ў выбарах і абвясціў байкот. Яго падтрымлівалі і мясцовыя літоўцы. У выніку ў выбарах прынялі ўдзел 64,4% выбаршчыкаў, якія абралі толькі "прапольскіх" дэпутатаў. 20 лютага 1922 г. новы сойм Сярэдняй Літвы прыняў рашэнне аб далучэнні да Польшчы, якое падтрымала Ліга Нацый. 24 сакавіка гэтае рашэнне пацвердзіў польскі сойм, і дзяржава спыніла сваё існаванне.

6 красавіка 1922 г. Сярэднюю Літву пераўтварылі ў Віленскую зямлю на правах ваяводства. У снежні 1925 г. Віленскую зямлю назвалі Віленскім ваяводствам, у 9 паветах якога большасць складала беларускае насельніцтва. Аднак успаміны пра Сярэднюю Літву яшчэ жылі сярод мясцовых жыхароў. Напрыклад, у 1926 г. у Гродне Каміла Макрэцкая напісала паэму "1919 год, альбо Песня пра літоўска-беларускія дывізіі", дзе былі адлюстраваны мясцовыя "краёвыя" настроі.

У верасні 1939 г. у Вільню ўвайшлі савецкія войскі. 10 кастрычніка савецкі ўрад перадаў Вільню і частку Віленшчыны (7 120 кв. км з 457 000 жыхароў) Літве. Даведаліся ж пра гэта беларусы толькі 1 лістапада 1939 г., пасля выбараў у Народны сход Заходняй Беларусі. 2 лістапада ў Вярхоўным Савеце СССР камісар замежных спраў Вячаслаў Молатаў на гэты конт сказаў наступнае: "Віленскі край належыць да Літвы не па сваім насельніцтве. Мы ведаем, што большасць насельніцтва ў гэтым раёне — не літоўцы. Але гістарычная мінуўшчына і памкненні літоўскага народу шчыльна звязаныя з горадам Вільняй, і ўрад СССР палічыў неабходным пайсці насустрач гэтым маральным меркаванням"[12].

У савецкія часы пра Сярэднюю Літву, у адрозненне ад ЛітБела, не згадвалі ў школьных і універсітэцкіх падручніках. І толькі цяпер гістарычная праўда вяртаецца да нас.

---

[1] Литва: Краткая энциклопедия. Вильнюс, 1989. С. 31.

[2] Круталевич В.А.Рождение Белорусской Советской Республики. Мн., 1979. С. 286.

[3] История Литовской ССР. Вильнюс, 1978. С. 344.

[4] Савіцкі В. Жалігоўскі Люцыян // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. Мн., 1996. С. 363.

[5] Дубік С., Чарнякевіч А. Сярэдняя Літва // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6. Кн. 1. Мн., 2001. С. 484.

[6] Michel. Europa-Katalog. Ost. 1999/2000. München. S. 451—452.

[7] Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі, 1795—2002. Мн., 2003. С. 258.

[8] Купала Я. П'есы. Публіцыстыка. Янка Купала пра сябе. Мн., 2002. С. 371.

[9] Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. Мн., 1996. С. 96.

[10] Чарнякевіч А.М. Сярэдняя Літва // Беларуская энцыклапедыя ў 18 тамах. Т. 15. Мн., 2002. С. 362.

[11] Вильнюсский край // Литва: Краткая энциклопедия. С. 186.

[12] Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. С. 103.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Паважаныя чытачы нашага часопіса!**

Паведамляем вам адрасы гандлёвых кропак УП "Мінгарсаюздрук", у якіх будзе рэалізоўвацца "Беларускі гістарычны часопіс" у 2004 г.

***Ленінскі раён:*** магазін № 4, вул. Леніна, 15; магазін № 14, вул. Валадарскага, 22, тэл. 227-75-55; магазін № 25, вул. К.Маркса, 21; кіёск № 10, вул. К.Маркса, 38; кіёск № 11, пр. Ф.Скарыны, 10; кіёск № 110, вул. Пуліхава, 3.
***Цэнтральны раён:*** магазін № 10, бульвар Т.Шаўчэнкі, 7; магазін № 16, вул. В.Харужай, 24, корп. 2; магазін № 18, пл. Перамогі, пераход; магазін № 19, пр. Машэрава, 51; кіёск № 79, пр. Машэрава, 5; кіеск № 108, вул. Няміга, 7.
***Кастрычніцкі раён:*** магазін № 1, вул. Жукоўскага, 5; кіёск № 38, вул. Савецкая, 18; кіёск № 41, вул. Маскоўская, 20; кіёск № 228, вул. Рабкораўская, 17.
***Маскоўскі раён:*** магазін № 15, вул. М.Танка, 16; кіёск № 103, вул. Няміга, 2.
***Фрунзенскі раён:*** магазін № 21, метро "Пушкінская".
***Савецкі раён:*** магазін № 7, вул. Я.Коласа, 67; магазін № 8, вул. Сурганава, 40.
***Першамайскі раён:*** магазін № 3, пр. Ф.Скарыны, 76, тэл. 232-46-23; кіёск № 131, пр. Ф.Скарыны, 81; кіёск № 161, пр. Ф.Скарыны, 64.
***Завадскі раён:*** кіёск № 254, вул. Сурганава, 17.
***Партызанскі раён:*** магазін № 2, пр. Ф.Скарыны, 44; кіёск № 136, пераход ст. метро "Плошча Якуба Коласа"; кіёск № 198, БДЭУ (Партызанскі пр., 26, вуч. корп. № 2).